*больш з табою ўжо ніколі я не разлучуся*". Сапраўды не разлучалі, калі сьведамых беларусаў, *заходнікаў*, везьлі ў Сібір разам з усходнікамі. Сапраўды, як *заходнікам*-таптухай, заганялі ў сьветлае камуністычнае заўтра.

Была зьнішчаная створаная з падтрымкі Масквы Камуністычная Партыя *Заходняй* Беларусі. Абрэвіятура КПЗБ чыталася з трагічнай ірoніяй — камэра папярэдняга зьняволеньня Беларусі. Пасьля вайны давынішчалася беларуская інтэлігенцыя — настаўніцтва, духавенства. Гаспадароў, якія ў бальшавікоў зваліся кулакамі, раскулачвалі, высылалі. А на месца *заходнікаў* засяляліся ўсходнікі з Расеі, з усходняй Беларусі.

Недзе да канца 70-ых гадоў сакратарамі райкамаў ды абкамаў, іншымі намэнклятурнымі работнікамі назначаліся вылучна ўсходнікі — *заходнікам* не давяралі.

Цяпер фармальна няма мяжы між *заходнікамі* і ўсходнікамі, але ў душах яна яшчэ доўжыцца. *Заходнікі* — большай эўрапейскай арыентацыі, *заходнікі* болей верныя беларушчыне. Толькі час і свабода сьціраюць межы ў душах.

# Зацьменьне

***Аляксандар Лукашук***

У дзень *зацьменьня* ўсе позіркі скіраваныя на Сонца.

Кароткі момант адвечнага суіснаваньня сьвятла й ценю, калі той становіцца гаспадаром, перамагае і захоплівае тэрыторыю сьвятла.

Апошняе ў XX стагодзьдзі астранамічнае *зацьменьне* ў Беларусі цягнулася каля дзьвюх хвілінаў. Увогуле, найдаўжэй Месяц можа засланіць Сонца толькі на сем з паловаю хвілінаў. У беларускім жыцьці XX стагодзьдзя, наадварот, гэтаксама коратка, як мусіць доўжыцца *зацьменьне*, панавала сьвятло — спачатку Беларускай Народнай Рэспублікі, потым новай незалежнасьці пачатку 90-х. На беларусаў доўгі цень у XX стагодзьдзі падаў адразу зь дзьвюх суседніх сталіцаў — з Усходу й Захаду.

Але Сонца ці цень — выбар, які ўвесь час стаіць і перад самой Беларусяй. Уся краіна — як прыродны асяродак крата, зь якім на пачатку стагодзьдзя параўнаў свой народ паэт. „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ" — яшчэ адзін паэтычны голас зь цемры, адтуль, дзе няма Сонца. „На прастор, на шырокі разлог выхадзі, мой народ, грамадою" — заклік трэцяга нацыянальнага клясыка, таксама зьвернуты ў царства змроку, падзем'е.

Толькі на вольнай арбіце нябеснае цела не залежыць ад чужога ценю.

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асьляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы,
Калісь глядзеў на сонца я.

Да Сонца — нацыянальная задача стагодзьдзя.

# Зацяжка

***Антаніна Хатэнка***

Здаўна кажуць: адклад ня йдзе ў лад — і гэта чыстая праўда. *Зацягнуць* якую справу — азначае почасту ня выканаць яе ўвогуле.